Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар УА «Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры і мастацтваў»
___________________Ю. П. Бондар
«_____» ________________ 2013 г.
Рэгістрацыйны № ВД- _____ /вуч.

# ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВАЎ

*Праграма ўступнага іспыту*
*па спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі*
*1-21 80 14 Мастацтвазнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2013

**Складальнікі:**

*В. П. Пракапцова,* загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;

*А.Я.Корсакава,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*Т.М.Бабіч,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства;

*А.М.Шаройка,* ст. выкладчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 31.08.2011 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 1 ад 11.10.2011 г.)

Адказны за рэдакцыю *В. Б. Кудласевіч*
Адказны за выпуск *В. П. Пракапцова*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

## Патрабаванні да дыпламаванага спецыяліста, якія прадугледжаны адукацыйным стандартам

Выпускнікі першай ступені вышэйшай адукацыі (ВНУ) павінны паказаць дастатковы ўзровень ведаў і ўменняў у сферы спецыяльных дысцыплін, дысцыплін спецыялізацыі для ажыццяўлення сацыяльна-прафесійнай дзейнасці.

Выпускнікі першай ступені вышэйшай адукацыі (ВНУ) павінны валодаць пэўнымі акадэмічнымі кампетэнцыямі (базавымі навукова-тэарэтычнымі ведамі для рашэння тэарэтычных і практычных задач, сістэмным і параўнальным аналізам, даследчымі навыкамі, самастойным мысленнем, крэатыўнасцю, міждысцыплінарным падыходам пры рашэнні праблем).

Выпускнікі першай ступені вышэйшай адукацыі (ВНУ) павінны валодаць прафесійнымі кампетэнцыямі па відах дзейнасці (навукова-даследчая дзейнасць у галіне мастацтвазнаўства, аналітычная дзейнасць, арганізацыйная дзейнасць).

Выпускнікі першай ступені вышэйшай адукацыі (ВНУ) павінны валодаць псіхалогіяй успрымання мастацтва, педагагічных асноў эстэтычнага выхавання і мастацкай адукацыі, суадносіць нацыянальныя мастацкія школы, вызначаць месца і своеасаблівасць беларускага мастацтва ў сусветным мастацкім працэсе, набываць новыя веды, выкарыстоўваючы сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ УСТУПНАГА ІСПЫТУ

**1. Музыка як від мастацтва**

Музыка і яе роля ў сістэме мастацкай культуры. Спецыфіка музычнага мастацтва. Этапы развіцця музычнага мастацтва. Музычныя стылі і кірункі. Музычная форма. Асноўныя жанры музычнага мастацтва. Музычныя інструменты (прафесійныя і народныя). Віды аркестраў. Пеўчыя галасы і іх класіфікацыя.

**2. Выяўленчае мастацтва як від мастацтва**

Выяўленчае мастацтва і яго роля ў сістэме мастацкай культуры. Спецыфіка выяўленчага мастацтва. Віды выяўленчага мастацтва: жывапіс, скульптура, графіка і іх узаемаўплыў. Віды выяўленчага мастацтва па тэхніцы, матэрыяле і прызначэнні. Асноўныя этапы развіцця выяўленчага мастацтва. Стылі, эпохі і кірункі. Важнейшыя дэфініцыі: мастацкі вобраз, форма, сродкі мастацкай выразнасці. Асноўныя жанры выяўленчага мастацтва.

**3. Тэатр як від мастацтва**

Тэатр і яго месца ў сістэме мастацкай культуры. Спецыфіка тэатральнага мастацтва. Яго сінтэтычны характар. Узнікненне і этапы развіцця тэатральнага мастацтва. Віды тэатра (драматычны, оперны, балетны, лялечны, пластычны, тэатр ценяў і інш.). Асноўныя мастацкія плыні развіцця тэатра – класіцызм, сентыменталізм, рамантызм, рэалізм, сімвалізм і інш. Сродкі сцэнічнай выразнасці. Спецыфіка і сутнасць акцёрскага майстэрства. Роля рэжысёра ў тэатры. Сцэнаграфія як сукупнасць прасторавага вырашэння спектакля. Тэатр і глядач.

**4. Кіно як від мастацтва**

Кіно як люстэрка ХХ ст. Паняцці «кінематограф», «кінамастацтва». Сінтэтычная прырода кіно, яго месца ў сям'і традыцыйных і экранных мастацтваў. Прасторава-часавы кантынуум кіно. Асновы кінамовы. Мастацкая цэласнасць кінатвора. Віды кіно. Праблема жанравай класіфікацыі ў кіно. Музычны фільм. Асаблівасці творчага працэсу ў рамках кінаіндустрыі. Асноўныя этапы развіцця сусветнага кінематографа, прынцыпы перыядызацыі. Іх кароткая характарыстыка. Кіно і глядач.

**5. Мастацкая культура эпохі Антычнасці**

Асноўныя этапы развіцця грэчаскай мастацкай культуры. Сінтэз архітэктуры і скульптуры Акропаля. Культ Дыяніса і яго роля ў паходжанні старажытнагрэчаскага тэатра. Жанры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатра. Мастацкія сродкі спектакля. Тэорыя музыкі, музычныя інструменты, вакальная музыка Старажытнай Грэцыі. Агульная характарыстыка рымскага мастацтва і яго адрозненне ад грэчаскага. Архітэктура, скульптура, жывапіс Старажытнага Рыма. Вытокі рымскага тэатра. Асаблівасці тэатральнай архітэктуры ў Старажытным Рыме. Музыка Старажытнага Рыма: асноўныя жанры, інструменты.

**6. Мастацкая культура эпохі Сярэднявечча**

Перыядызацыя. Асноўныя стылістычныя рысы раманскай архітэктуры. «Звярыны стыль» у раманскім выяўленчым мастацтве. Адрозненні гатычнага сабора ад раманскага. Сінтэз архітэктуры, жывапісу і скульптуры ў гатычным саборы. Вітражы і іх каларыстычныя эфекты. Народныя вытокі тэатра ў краінах Еўропы. Літургічная драма. Жанры драматургіі: міракль, містэрыя, маралітэ. Свецкая і духоўная музыка. Антыфонныя спевы і з'яўленне грыгарыянскага харала. Зараджэнне натацыі. Фарміраванне рыцарскай культуры. Дзейнасць трубадураў, трувераў, мінезінгераў. Асноўныя жанры іх творчасці. Музычныя інструменты эпохі Сярэднявечча.

**7. Мастацкая культура эпохі Адраджэння**

Асноўныя характарыстыкі духоўнай культуры Адраджэння. Асаблівае месца Італіі ў стварэнні мастацкай культуры Рэнесансу. Фларэнцыя як галоўны цэнтр Рэнесансу. Майстры Ранняга (Мазача, Гіберці, Данатэла, Брунелескі, Сандра Батычэлі), Высокага Адраджэння (Брамантэ, Леанарда да Вінчы, Рафаэль Санці, Мікеланджэла Буанароці) і Венецыянскай школы архітэктуры (Паладзій, Якопа Сансавіта, Джарджоне і Тыцыян, Веранезэ і Цінтарэта). Нідэрландскае Адраджэнне (Ван Эйк, Ван дэр Вейдзен, Ван дэр Гус, І.Босх, П.Брэйгель). Рэнесансны жывапіс Германіі пачатку XVI ст. (Груневальд, А.Дзюрэр, Л.Кранах, Г.Гольбейн). Майстры французскага Адраджэння (Ж. і Ф.Клуэ, скульптары Гужон і Пілон).

**8. Шматграннасць творчай дзейнасці Леанарда да Вінчы**

Універсальнасць асобы мастака. Рацыянальны пачатак у творчасці, непарыўная сувязь мастацкіх і навуковых інтарэсаў. Малюнкі Леанарда. Штудыі анатоміі, руху, жэстаў, мімікі. Асаблівасці творчага метаду і мастацкага мыслення майстра. Фрэска «Тайная вячэра» ў трапезнай манастыра Санта-Марыя дэла Грацыя ў Мілане. Леанарда і тэорыя святлопаветранай перспектывы. «Мадонна ў гроце», «Мадонна Бенуа» і «Мадонна Літа». Уклад мастака ў мастацтва партрэта: «Джаконда».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**9. Творчасць І.-С.Баха**

Асаблівасці развіцця нямецкага музычнага мастацтва эпохі барока. Духоўныя кантаты І.-С.Баха: Меса h-moll, «Страсці» («Пасіёны»). Свецкія кантаты («Кафейная кантата»). Пераасэнсаванне традыцыйных жанраў арганнай музыкі: такаты, фантазіі, пасакаліі. Інструментальная музыка. Клавірная музыка: канцэрты, «Добра тэмпарыраваны клавір», «Англійскія» і «Французскія» сюіты.

**10. Музычная культура Заходняй Еўропы эпохі барока (XVII–XVIII стст.)**

Стыль барока і яго характэрныя рысы. Опера як важнейшы музычна-тэатральны жанр італьянскага барока («dramma per musica»). Фарміраванне жанраў оперы-seria і оперы-buffa. Опернае мастацтва К.Мантэвердзі («Арфей»). Арганная школа і творчасць Дж.Фрэскабальдзі. Італьянская скрыпічная школа: А.Карэлі, Т.Альбіноні, А.Вівальдзі. Буйныя цыклічныя формы (concerto grosso, канцэрты, санаты). Развіццё французскага музычнага мастацтва ў XVII ст. Оперная творчасць Ж.Б.Люлі. Развіццё інструментальнай музыкі: школа клавесіністаў у Францыі (Ж.-Ф.Рамо, Ф.Куперэн). Музычна-тэарэтычныя працы: «Мастацтва ігры на клавесіне» Ф.Куперэна, «Трактат аб гармоніі» Ж.-Ф.Рамо.

**11. Тэндэнцыі развіцця класіцызму ў мастацтве Заходняй Еўропы**

Ідэйна-эстэтычныя прынцыпы класіцызму. Фарміраванне класіцызму ў французскім тэатры (П.Карнэль, Ж.Расін, Ж.-Б.Мальер) і паэзіі (Н.Буало). Асноўныя рысы класічнай архітэктуры: лагічнасць планіроўкі, яснасць аб'ёмнай формы, сіметрычнасць. Архітэктары класіцызму: А.Мансар, Ж.Перо, Л.Лёва, А.Блондэль, А.Ленотр, Ж.-Ф.Габрыэль (Францыя). Прыкметы класічнага жывапісу. Міфалагічныя, гістарычныя кампазіцыі і партрэт – галоўныя жанры жывапісу класіцызму. Найбуйнейшыя майстры: Н.Пусэн, Ж.-Л.Давід, Ж.Энгр. Асаблівасці музычнага класіцызму. Оперная рэформа К.-В.Глюка («Арфей», «Альцэста»).

**12. Венская класічная школа**

Асноўныя мастацка-эстэтычныя прынцыпы ў творчасці кампазітараў. Творчасць кампазітараў Венскай класічнай школы: Й.Гайдн, В.-А.Моцарт, Л. ван Бетховен. Інавацыі ў галіне фарміравання класічных жанраў (сімфонія, саната, канцэрт для



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

інструмента з аркестрам), форм (санатная форма, санатна-сімфанічны цыкл), прынцыпаў развіцця (матыўна-тэматычная распрацоўка), саставаў аркестра. Фарміраванне саставу сімфанічнага аркестра.

**13. Творчая дзейнасць В.-А. Моцарта**

Феномен В.-А.Моцарта ў сусветным музычным мастацтве. Шматграннасць творчай дзейнасці кампазітара. Оперная спадчына кампазітара. Оперы «Вяселле Фігара», «Дон Жуан», «Чароўная флейта»: сюжэт, гісторыя стварэння, вядомыя пастаноўкі. Распрацоўка сімфанізму як вышэйшага тыпу музычнай думкі, разуменне музычнай гармоніі як канцэпцыі кампазітарскага мыслення і светаўспрымання, мастацкасць музычных вобразаў, іх узаемадзеянне (на прыкладзе опер, сімфоній, санат і інш.).

**14. Мастацкая культура Расіі ад вытокаў да XVIII ст.**

Візантыя і Старажытная Русь: агульнае і асаблівае. Гістарычныя перадумовы фарміравання мастацкай культуры Старажытнай Русі. Высокі ўзровень развіцця мастацкіх рамёстваў (ліцця, чаканкі, керамікі, вышыўкі, ювелірнай справы, разьбы) і драўлянага будаўніцтва дахрысціянскай Русі. Асаблівасці старажытнарускага дойлідства. Лакальныя архітэктурныя стылі Уладзіміра-Суздальскага, Наўгародскага, Пскоўскага і іншых княстваў. Выдатныя помнікі рускага сярэднявечнага дойлідства: храм Сафіі Кіеўскай, Сафійскі сабор у Ноўгарадзе, царква ў Кіжах, Успенскі і Дзмітрыеўскі саборы ва Уладзіміры, царква Пакрова на Нэрлі, Пскоўскі крэмль, храмы Маскоўскага Крамля, сабор Васіля Блажэннага ў Маскве. Віды старажытнарускага выяўленчага мастацтва: мазаіка, фрэска, абраз. Кампазіцыя іканастаса. Эвалюцыя старажытнарускага выяўленчага мастацтва ў творчасці Феафана Грэка, Андрэя Рублёва, Дзіянісія, Сымона Ушакова.

**15. Мастацкая культура Расіі XVIII ст.**

Еўропацэнтрысцкая арыентацыя Расіі. Пераход ад Сярэднявечча да Новага часу, ад царкоўнага тыпу культуры да свецкага. Заснаванне Пецярбурга (сталіцы, крэпасці, порта) і фарміраванне рускай барочнай архітэктуры. Маскоўская архітэктурная школа: В.Бажэнаў, М.Казакоў. Асаблівасці рускага класіцызму, яго фарміраванне ў творчасці Ж.Вален-Дэламота і А.Какорынава. Новыя тэндэнцыі ў рускім жывапісе XVIII ст. Сцвярджэнне свецкіх жанраў: партрэта, пейзажа, карцін на

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міфалагічныя і гістарычныя тэмы, жанравага жывапісу. Асаблівасці рускай скульптуры XVIII ст., яе разнавіднасці (партрэт, манументальная статуя, дэкаратыўны барэльеф, медальёны). Творчасць Б.К.Растрэлі, Ф.Шубіна, А.Гардзеева і інш.

**16. Рамантызм як мастацкі кірунак у мастацкай культуры Заходняй Еўропы XIX ст.**

Рамантызм як ідэйна-мастацкі кірунак: прадстаўнікі, асноўныя тэмы і жанры. Развіццё гарадской культуры, узнікненне новых тэатраў, музычна-асветніцкіх арганізацый. Інструментальнае выканальніцтва як самастойны від прафесійнай дзейнасці (Н.Паганіні, Дж.Фільд, Ф.Шапэн, Ф.Ліст і інш.). Асноўныя прадстаўнікі рамантызму ў выяўленчым мастацтве (Т.Жэрыко, Э.Дэлакруа, А.Дам'е і інш.). Узнікненне і эвалюцыя рамантычнага тэатра. Новы герой рамантычнага мастацтва. Абнаўленне драматургічных жанраў, стылістыкі, сродкаў выразнасці. Стылявыя асаблівасці рамантызму ў французскай драматургіі і тэатры (В.Гюго, А.Стэндаль, А.Дзюма-бацька, А.-Э.Скрыб, А.Бальзак і інш.). Нямецкі рамантызм у драматургіі і тэатры (Г. фон Клейст, Г.Бюхнер і інш.). Асноўныя напрамкі развіцця англійскага рамантызму (Дж.Байрана і П.-Б.Шэлі.). Акцёрскае майстэрства Заходняй Еўропы першай паловы XIX ст. Фарміраванне нацыянальных акцёрскіх школ у Германіі (Ф.Флэк, Л.Дэўрыент), Францыі (П.Бакаж, М.Дарваль, Ф.Леметр, Э.Рашэль), Англіі (С.Сіданс, Д.-Ф. Кембл, Э.Кін).

**17. Імпрэсіянізм у музыцы і выяўленчым мастацтве (другая палова XIX ст.)**

Пошук новых сродкаў мастацкай выразнасці. Зараджэнне эстэтыкі імпрэсіянізму ў французскім жывапісе і ў музычнай культуры Францыі (апошняя трэць XIX ст.). Творчасць К.Дэбюсі і М.Равеля. Імпрэсіянізм у жывапісе. Творчасць Э.Манэ, П.-А.Рэнуара, Э.Дэга, К.Манэ, К.Пісаро, А.Сіслея і інш. Выкарыстанне эстэтыкі імпрэсіянізму ў творчасці рускіх мастакоў К.Каровіна і І.Грабара. Імпрэсіянізм у скульптуры. Творчасць А.Радэна, Э.Дэга.

**18. Музычная культура Заходняй Еўропы XX ст.: панарама стыляў і кірункаў**

Новыя напрамкі развіцця заходнееўрапейскага музычнага мастацтва пачатку XX ст.: неакласіцызм, неарамантызм, неафальклaрызм. Неакласіцызм у творчасці Ф.Бузоні, М.Равеля,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

П.Хіндэміта, І.Стравінскага, Э.Віла-Лобаса. Неарамантызм у творчасці Р.Штрауса, Г.Малера, А.Брукнера. Зараджэнне экспрэсіянізму ў музычнай культуры Аўстрыі і Германіі (першая чвэрць XX ст.). Творчасць кампазітараў Новавенскай школы (А.Шонберг, А.Берг, А.Вэберн). Стварэнне метаду дадэкафоніі, серыйнай тэхнікі.

**19. Асноўныя мастацкія плыні і кірункі ў выяўленчым мастацтве Заходняй Еўропы XX ст.**

Архітэктура XX ст. Функцыяналізм (канструктывізм): мастацкая школа «Баўхаўз» у Германіі, творчыя шуканні Карбюзье. Скульптура XX ст. Творчасць А.Маёля, Э.-А.Бурдэля і інш. Выяўленчае мастацтва XX ст. Мастацкія кірункі: абстракцыянізм (П.Сулаж, Х.Хартунг), кубізм (П.Пікаса), дадаізм (Ф.Пікабія, М.Эрнст), сюррэалізм (С.Далі), ташызм (Дж.Полак), поп-арт (Э.Уорхал, Р.Гамільтон), оп-арт (В.Вазарэлі), неарэалізм (А.Фужэрон, Ж.Эфель, Р.Гутуза). Пераемнасць мастацкіх эпох і стыляў. Адмаўленне як адзін са шляхоў эвалюцыі мастацтва. Імкненне да разнастайнага адлюстравання карціны свету ў розных відах і жанрах мастацтва. Невычэрпныя магчымасці мастацкай мовы. Праблемы і перспектывы сучаснага мастацтва.

**20. Еўрапейская опера XIX ст.: кірункі, мастацкія трансфармацыі**

Заходнееўрапейскі музычны тэатр другой паловы XIX ст. Шматграннасць творчасці Р.Вагнера і яго оперная рэформа («Кальцо Нібелунгаў»). Увасабленне канцэпцыі музычнай драмы («Трыстан і Ізольда», «Лаэнгрын»). Творчасць Дж.Вердзі і абнаўленне канцэпцыі жанру оперы. Высокі гуманізм оперных сюжэтаў разам з адлюстраваннем сацыяльных канфліктаў («Травіята», «Рыгалета»), зварот да нацыянальна-вызваленчай ідэі, звязанай з асабістай драмай герояў («Аіда», «Баль-маскарад»). Уздзеянне творчасці Дж.Вердзі на фарміраванне эстэтыкі верызму (верысцкія оперы «Сельскі гонар» П.Масканьі і «Паяцы» Р.Леанкавала). Творчасць Ж.Бізэ, увасабленне прынцыпаў рэалізму ў оперы «Кармэн».

**21. Асноўныя прынцыпы развіцця мастацкай культуры Расіі першай паловы XIX ст. (тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва)**

Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ўмовы развіцця Расіі ў першай палове XIX ст. Рускі рамантызм. Творчасць А.Кіпрэн-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

скага, С.Шчадрына, В.Трапініна. Сялянская тэматыка ў творах А.Г.Венецыянава. Спалучэнне традыцый класіцызму з рамантызмам і рэалізмам у творчасці К.Брулова. І.К. Айвазоўскі – мастак-марыніст. Творчасць А.Іванова. П.А. Фядотаў – заснавальнік крытычнага рэалізму ў рускім жывапісе. Творчасць скульптараў М.Сакавікова, Ф.Талстога, П.Клота. Рускі тэатр перыяду «прагрэсіўнага рамантызму». Драматургія А.Грыбаедава, А.Пушкіна, М.Лермантава, М.Гогаля. Сцэнічнае мастацтва М.Шчэпкіна, П.Мачалава, В.Каратыгіна і інш. Фарміраванне асноўных музычных жанраў: песня, раманс, опера, балет. М. Глінка – заснавальнік рускай класічнай музыкі. Асноўныя жанры яго творчасці. Сусветнае значэнне мастацтва М.Глінкі.

**22. Мастацкая культура Расіі другой паловы XIX ст. (тэатр, музыка, выяўленчае мастацтва)**

Асаблівасці развіцця мастацкай культуры Расіі ў другой палове XIX ст. Значэнне Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства ў развіцці дэмакратычнага мастацтва гэтага часу. Творчасць В.Пярова. «Бунт 14». Стварэнне Арцелі мастакоў у Санкт-Пецярбургу. «Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў» і яго значэнне як ідэйнага і мастацкага цэнтра рускага прагрэсіўнага мастацтва. І.Крамскі як кіраўнік школы перасоўнікаў. Жанравы жывапіс перасоўнікаў (Р.Мясаедаў, К.Савіцкі, У.Максімаў, У.Макоўскі, М.Ярашэнка і інш.). Гістарычны жывапіс перасоўнікаў (М.Ге і інш.). Творчасць В.Васняцова. Пейзажны жывапіс перасоўнікаў. Сцвярджэнне прынцыпаў рэалістычнага пейзажа. Творчасць А.Саўрасава, І.Шышкіна, В. Паленава, А.Куінджы. Батальны жывапіс В.Верашчагіна. Творчасць І. Рэпіна і В.Сурыкава як вяршыня перасоўніцтва. «Сцэнічны рэалізм»: драматургія А.Астроўскага, А.Чэхава, Л.Талстога, М. Горкага і інш. Сцэнічнае мастацтва М.Ярмолавай, П.Садоўскага, М.Савінай, В.Камісаржэўскай. Дэмакратызацыя музычнага мастацтва Расіі. Рэалізм у творчасці кампазітараў «Магутнай кучкі». Творчасць П.Чайкоўскага, А.Сярова, А.Рубінштэйна і інш. Асноўныя жанры дадзенага перыяду: опера, балет, праграмная сімфанічная музыка, раманс.

**23. Музычная культура Расіі XX ст. (савецкі перыяд)**

Перыядызацыя, найбуйнейшыя прадстаўнікі (кампазітары, выканаўцы, творчыя аб’яднанні). Сацрэалізм як вядучы метад развіцця савецкага мастацтва. Жанр масавай песні ў творчасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

савецкіх кампазітараў (І.Дунаеўскі, браты Пакрас). Творчасць С.Пракоф'ева, Д.Шастаковіча. Музычнае мастацтва перыяду Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенных гадоў. Масавая песня, песні ваенных гадоў (А.Аляксандраў, Б.Макравусаў, М.Блантэр, У.Салаўёў-Сяды). Патрыятычная накіраванасць пасляваенных твораў Д.Шастаковіча, С.Пракоф'ева, А.Хачатурана. Асаблівасці развіцця рускага савецкага музычнага мастацтва ў 1950–1980-я гг. Супярэчлівасць пафаснага «афіцыйнага» мастацтва і авангардысцкіх пошукаў (творчасць Г.Канчэлі, А.Шнітке, Э.Дзянісава, С.Губайдулінай). Папулярызацыя бардаўскіх/аўтарскіх песень (Ю.Візбар, Б.Акуджава, Ю.Кім). Савецкі мюзікл (А.Рыбнікаў). Кінамузыка (М.Тарывердзіеў, А.Пахмутава, А.Пятроў). Дзіцячая песня (Я.Фрэнкель, У.Шаінскі, Г.Гладкоў).

**23. Выяўленчае мастацтва і архітэктура ў Расіі ХХ ст. (савецкі перыяд)**

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя як пачатак новага этапу ў гісторыі развіцця мастацтва. Ленінскі план манументальнай прапаганды. Рэалізацыя гэтага плана ў творах манументальнай скульптуры і жывапісе. Узнікненне і развіццё савецкага палітычнага плаката. Асацыяцыя мастакоў рэвалюцыйнай Расіі і Таварыства станкавістаў як найбольш значныя творчыя арганізацыі дваццатых гадоў. Усесаюзны конкурс і ўрадавыя рашэнні па будаўніцтве Палаца Саветаў у Маскве. Творчасць В.Мухінай, С.Каненкава, М.Манізера і інш. Творчасць М.Несцерава, А.Дзейнекі, Ю.Піменава. Асаблівасці архітэктуры 1920–1930-х гг.: канструктывізм, рацыяналізм, манументалізм. Значэнне творчасці савецкіх мастакоў у гады вайны. Мабілізуючая роля плаката. Творчасць Кукрыніксаў. Развіццё шматнацыянальнага савецкага выяўленчага мастацтва. Скульптурныя творы і мемарыяльныя комплексы, прысвечаныя героям і ахвярам вайны. Мастакі «суровага стылю» 1960-х гг. (П.Нікана́ў, браты Смоліны, М.Андронаў, Г.Корж, Т.Салахаў і інш.). Жывапіс, скульптура, графіка 1970–1980-х гг. (Д.Жылінскі, Т.Назаранка, Н.Несцерава, Д.Мітлянскі, Д.Бісці, І.Галіцын і інш.). Савецкі канцэптуалізм і соц-арт. Творчасць І.Глазунова, А.Шылава, М.Шамякіна, Э.Невядомага, З.Цэрэтэлі.

**25. Тэатральнае мастацтва Расіі першай паловы ХХ ст.**

Развіццё савецкага тэатральнага мастацтва ў паслярэвалюцыйны перыяд. Дзейнасць савецкіх тэатраў (агітацыйных, кал-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

гасна-саўгасных, ТРАМаў). Рускі савецкі тэатр 1920–1930-х гг. Мастацтва МХТ. Тэатральная дзейнасць К.Станіслаўскага і У.Неміровіча-Данчанкі ў паслярэвалюцыйны перыяд. Сістэма выхавання акцёра і яе вызначэнне ў працы «Маё жыццё ў мастацтве» К.Станіслаўскага. У.Неміровіч-Данчанка – тэатральны дзеяч, драматург, рэжысёр і педагог. Міхаіл Чэхаў – выбітны рускі акцёр, рэжысёр, педагог. Рэжысёрская дзейнасць Я.Вахтангава. Студыйны рух. Канструктывізм і біямеханіка ў творчасці тэарэтыка і практыка ўмоўна-сімвалісцкага тэатра У.Э.Меерхольда. Руская драматургія 1920–1930-х гг. Творчасць рэжысёраў – Р.Сіманава, М.Ахлопкава, Ю.Завадскага.

**26. Тэатральнае мастацтва Заходняй Еўропы першай паловы ХХ ст.**

Новыя мастацкія тэндэнцыі ў развіцці заходнееўрапейскага тэатра першай паловы ХХ ст. Экспрэсіянізм як мастацкі кірунак у нямецкім тэатры. Экспрэсіянізм у акцёрскім мастацтве і рэжысуры (Г.Хартунг, Р.Вайхерт, Л.Еснер, К.Марцін, Ю.Фелінг). Творчасць Б.Брэхта як вяршыня нямецкай драматургіі ХХ ст. «Эпічны» («нетрадыцыйны», «небуржуазны») тэатр Б.Брэхта. Драматургія Францыі першай паловы ХХ ст. (А.Салакру, Ж.Както, Ж.Ануй і інш.). Эклектыка і рысы мадэрнізму ў драматургіі Ж.Както. Французская інтэлектуальная драма: Ж.Жыраду. Канцэпцыя «тэатра жорсткасці» А.Арто. Тэарэтычная праца А.Арто «Тэатр і яго двайнік». Футурызм у італьянскім тэатральным мастацтве (Л.Пірандэла, Э.дэ Філіпа, Ф.Лорка).

**27. Тэатральнае мастацтва Заходняй Еўропы другой паловы ХХ ст.**

Драматургія і сцэнічнае мастацтва Германіі 1960–1990-х гг. «Дакументальная драма». Драматургія П.Штайна і яго пастаноўкі ў тэатры «Шаўбюне». Французскі тэатр і драматургія. Экзістэнцыялізм і драматургія Ж.-П.Сартра: «Мухі», «За зачыненымі дзвярыма». Творчасць А.Камю. Тэатр абсурду – новы этап у развіцці сусветнага тэатра другой паловы ХХ ст. Прадстаўнікі тэатра абсурду: Э.Іанеска («Лысая спявачка», «Насарог», «Крэслы»), С.Бекет («У чаканні Гадо», «Шчаслівыя дні»), Ж.Жанэ («Служанкі», «Шырмы»), Г.Пінтэр («Пейзаж», «Дзень нараджэння»), Ф.Арабаль («Пікнік», «Сад асалод»), С.Мрожак («Кароль», «Стрыптыз», «Эмігранты»). Разнастайнасць мастацкіх напрамкаў у тэатральным мастацтве і драма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тургіі Англіі ў XX ст. (У.Моэм, Дж.Прыстлі). Тэатр Швецыі другой паловы XX ст. і драматургія М.Фрыша («Санта Крус», «Дон Жуан, або Любоў да геаметрыі»), Ф.Дзюрэнмата («Візіт старой дамы», «Ромул Вялікі», «Франк V»). Сцэнічнае мастацтва ЗША. Брадвейскія тэатры. Мюзікл на амерыканскай сцэне. Творчасць Э.-Л.Уэбера: мюзіклы «Кошкі», «Эвіта», «Прывід оперы», рок-опера «Ісус Хрыстос – суперзорка» і інш. Драматургія Т.Уільямса, Э.Олбі. Тэатральнае мастацтва Польшчы другой паловы XX ст. «Тэатр-лабараторыя» Е.Гратоўскага.

**28. Кінамастацтва Заходняй Еўропы першай паловы XX ст.: этапы, стылі**

Зараджэнне і фарміраванне кінематографа ў Еўропе. Першы публічны кінасеанс (1895). «Дакументальныя» фільмы Л. і А.Люм'ераў. Ж.Мельес – родапачынальнік ігравога кіно. Кінамастацтва Германіі 1920-х гг. Мастацкія дасягненні нямецкага кінаэкспрэсіянізму, яго галоўныя філасофска-эстэтычныя прынцыпы. Французскі кінаавангард (1919–1930). Група Л.Дэлюка. Канцэпцыя «інтэгральнага фільма» (А.Шамет, Ж.Эпштэйн, Ж.Дзюлак), адмаўленне сюжэта і акцёра. Уплыў сюррэалізму. Адкрыццё гуказапісу (1927) і новыя эстэтычныя задачы гукавога кіно. Трансфармацыя мадэлі кінаапавядання ў 1930-я гг. (ад ліра-эпічнай да эпіка-драматычнай). Персаніфікацыя героя. Французскі паэтычны рэалізм. Творчасць Ж.Віго і М.Карнэ. Італьянскі неарэалізм. «Рым – адкрыты горад» (1945) Р.Раселіні – эстэтычная рэалізацыя праграмы неарэалізму. Росквіт неарэалістычнага мастацтва (1945–1951), яго месца ў кіно Італіі і роля ў сусветным кіно.

**29. Кінамастацтва Заходняй Еўропы другой паловы XX ст.: этапы, стылі**

Асноўныя мастацкія прынцыпы французскай «новай хвалі». Маладзёжны анархізм рэжысёраў, якія прыйшлі з журналістыкі і кінакрытыкі: К.Шаброль, Ф.Труфо, Ж.Л.Гадар, Э.Рамер. Крызіс «новай хвалі». Крытыка цьмяных бакоў эпохі «эканамічнага цуду» ў нямецкім кіно 1960-х гг. Постаберхаўзенская група рэжысёраў і «новае нямецкае кіно» (Ф.Шлёндарф, В.Херцаг, Р.-В.Фасбіндэр, В.Вендэрс). «Раз'юшаныя» ў англійскай літаратуры і тэатры, іх уплыў на англійскае кіно ў 1958–1963-х гг. Буйнейшыя рэжысёры: Т.Рычардсан, К.Рэйш, Л.Андэрсан. Вытокі англійскага «неабарока» (К.Расел). «Кіно ідэі» П.Грынуэя. 1950-я гг.: новая сітуацыя ў іспанскім кінематографе. «Мала-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дое іспанскае кіно» 1960-х і ўплыў на яго кінастужак Л.Берлангі, Х.А.Бардэма, Л.Бунюэля. Крызіс «маладога іспанскага кіно» ў 1970-я гг. Метафарычнасць кінамовы К.Саўры, схільнасць да сімволікі. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця ў постфранкісцкай Іспаніі. Асэнсаванне падзей перыяду грамадзянскай вайны і франкісцкага рэжыму ў фільмах Г.Эральдэ, Б.Пацiна, Х.Камiна. Кіно Італіі. Творчасць М.Антаніёні, Ф.Феліні, Л.Вісконці. Эканамічныя цяжкасці шведскага кіно. Камерцыйная прадукцыя. Агульнамастацкая плыня фюртыёталізму ў шведскай пасляваеннай культуры. А.Шоберг – вядучы рэжысёр канца 1940 – сярэдзіны 1950-х гг. Творчасць І.Бергмана. «Новае шведскае кіно». Творчасць рэжысёраў Б.Відэрберга, Й.Донера, В.Шомана, Я.Труэля.

**30. Кінамастацтва Беларусі ХХ ст.**

Арганізацыя кінавытворчасці. Заснаванне кінастудыі «Савецкая Беларусь» (1928) у Ленінградзе. Ю.Тарыч і пачатак ігравога кіно. Авалоданне тэхнікай гуказапісу. Сучасная тэма на беларускім экране 1930-х гг.: савецкі лад жыцця і новыя тэмы герояў. Пераезд кінастудыі «Савецкая Беларусь» у Мінск (1939). Кінамастацтва ў часы Вялікай Айчыннай вайны. Прыход у 1960-я гг. у кіно новай генерацыі маладых кінематаграфістаў (В.Тураў, В.Вінаградаў, І.Дабралюбаў і інш.). Працэс абнаўлення выразных сродкаў у беларускім кінамастацтве. Зварот кінематаграфістаў да прозы В.Быкава. Экранізацыя твораў А.Адамовіча. Развіццё эпічнага жанру ў творчасці рэжысёра В.Чацверыкова. Экранізацыя твораў І.Мележа. Проза У.Караткевіча на беларускім экране. Аўтарскае прачытанне рэжысёрам В.Рыбаравым літаратурнага твора В.Адамчыка ў фільме «Чужая бацькаўшчына». Зварот рэжысёра В.Нікіфарава да рускай класічнай прозы. Кіно Беларусі 1990-х гг.: рысы крызісу, праблема выжывання, прыход у рэжысуру былых аператараў.

**31. Выяўленчае мастацтва Беларусі XVI–XVIII стст. Агульная характарыстыка**

Асноўныя перыяды развіцця барока на тэрыторыі Беларусі. Віленскае барока. Вядучыя архітэктары: Я.Глаўбіц, Дж.Сака, А.Гену, Ю.Фантана і інш. Стыль барока ў беларускім манументальна-дэкаратыўным мастацтве, іканапісе і свецкім жывапісе. «Сармацкі» партрэт і яго самабытныя рысы. Уплыў барока на пашырэнне сістэмы жанраў у мастацтве графікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Станаўленне архітэктуры класіцызму. Станаўленне Віленскай мастацкай школы. Педагагічная дзейнасць Ф.Смуглевіча, Я.Рустэма, К. Ельскага. Фарміраванне рамантызму ў беларускім выяўленчым мастацтве.

**32. Тэатральная і музычная культура Беларусі XVI–XVIII стст. Агульная характарыстыка**

Фарміраванне школьнага тэатра на тэрыторыі Беларусі (XVI–XVIII стст.). Дзейнасць прыватнаўласніцкіх (магнацкіх) тэатраў у Беларусі ў другой палове XVIII ст. Прыдворныя тэатры Радзівілаў, М.Агінскага, А.Тызенгаўза, С.Зорыча. Роля прыватнаўласніцкіх тэатраў у развіцці прафесійнага сцэнічнага мастацтва і мастацкай адукацыі ў Беларусі. Развіццё музычнага мастацтва ў брацкіх школах і манастырах. Зборнікі кантаў і псалмоў Сімяона Полацкага. «Псалтыр рыфмаваны». «Полацкі сшытак» – рукапісны зборнік свецкай кантавай музыкі. Музычная культура XVIII ст. Росквіт музычных тэатраў і аркестравага выканальніцтва. Аматарскае музіцыраванне. Кампазітары-аматары М.Радзівіл, М.К.Агінскі, Т.Касцюшка. Музычная адукацыя XVIII ст.

**33. Тэатральная і музычная культура Беларусі XIX ст. Тэатр В. Дуніна-Марцінкевіча**

Дзейнасць аматарскіх тэатраў беларускіх магнатаў Тышкевічаў, Сапегаў. Выступленні перасоўных тэатральных труп у гарадах Беларусі. Арганізацыя гарадскіх літаратурна-музычных гурткоў і таварыстваў у апошняй чвэрці XIX ст. Іх роля ў эстэтычным выхаванні, распаўсюджванні мастацкіх ведаў і адукацыі ў Беларусі. В.Дунін-Марцінкевіч – заснавальнік беларускага нацыянальнага тэатра. Творчы шлях драматурга. Дзейнасць аматарскага тэатра В.Дуніна-Марцінкевіча ў фальварку Люцынка. Развіццё тэатральных традыцый В.Дуніна-Марцінкевіча ў беларускім нацыянальным тэатры пачатку XX ст. Дзейнасць беларускіх кампазітараў XIX ст. С.Манюшкі, Н.Орды, А.Абрамовіча, Ф.Міладоўскага, Д.Стэфановіча, К.Марцінкевіч. Выкладчыцкая дзейнасць С.Шацкінай, Я.Чыжэўскага, Н.Муранскай, М.Рубінштэйна.

**34. Тэатральная культура Беларусі на мяжы XIX–XX стст. Тэатр Ігната Буйніцкага**

Актывізацыя тэатральнага жыцця ў Беларусі ў 1905–1907-я гг. Гастрольныя выступленні ў беларускіх гарадах вядомых рускіх акцёраў В.Камісаржэўскай, К.Варламава, А.Яблачкінай і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць аматарскіх тэатраў (Мінск, Магілёў, Орша і інш.). І.Буйніцкі як арганізатар беларускіх вечарынак, стваральнік беларускага прафесійнага тэатра. Першая беларуская трупа І.Буйніцкага. Асаблівасці тэатральных пастановак трупы І.Буйніцкага, яго роля ў распаўсюджванні беларускай культуры, літаратуры і мовы, народнага мастацтва.

**35. Тэатральная культура Беларусі XX ст.**

Актывізацыя тэатральнага руху пасля рэвалюцыі 1917 г. Дзейнасць гуртка мінскай інтэлігенцыі «Беларуская хатка» і арганізацыя на яго аснове Першага таварыства беларускай драмы і камедыі (1917–1920) на чале са Ф.Ждановічам. Творчасць Е.Міровіча, У.Галубка. Дзейнасць Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я.Купалы і Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я.Коласа. Вядучыя прадстаўнікі беларускага тэатральнага мастацтва: рэжысёры, акцёры, драматургі. Рэжысёрскія работы К.Саннікава, В.Раеўскага, Б.Луцэнкі, М.Пінігіна, В.Анісенкі і інш.

**36. Выяўленчае мастацтва Беларусі XX ст.**

Роля Віцебска ў станаўленні беларускай нацыянальнай школы выяўленчага мастацтва. Творчая дзейнасць Ю.Пэна, М.Шагала, К.Малевіча. Кубафутурызм і супрэматызм. Значэнне творчасці мастакоў групы «Сцвярджальнікі новага мастацтва» для развіцця манументальнага і афарміцельскага відаў выяўленчага мастацтва ў Беларусі. Архітэктурна-мемарыяльныя комплексы на тэрыторыі Беларусі 1960–1970-х гг., прысвечаныя героям Вялікай Айчыннай вайны: Курган Славы (А.Бембель, А.Арцімовіч), мемарыяльныя комплексы Хатынь (Ю.Градаў, В.Занковіч, Л.Левін, С. Селіханаў), Брэсцкая крэпасць-герой (А.Кібальнікаў, А.Бембель і інш.), мемарыял Урочышча Гай (М.Альтшулер, Д.Марэніч, М.Мілавідаў). Беларускае выяўленчае мастацтва ў кантэксце агульных плыняў 1950–1980-х гг. Тэматычная карціна, беларускі пейзаж і партрэт. Творчасць М.Савіцкага, В.Грамыкі, М.Данцыга, Г.Вашчанкі і інш. Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі 1970–1980-х гг. Наватарскія пошукі ў творах І.Кожуха, М.Селешчука, А.Пушкіна, У.Тоўсціка, В.Альшэўскага, Ф.Янушкевіча.

**37. Музычная культура Беларусі XX ст.**

Творчасць родапачынальнікаў прафесійнага музычнага мастацтва: Г.Вагнера, Р.Пукста, М.Аладава, М.Чуркіна, Я.Цікоцкага. Фарміраванне беларускай кампазітарскай школы ў 1960-я гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць А.Багатырова, Я.Глебава. Вакальная творчасць І.Лучанка, Э.Зарыцкага. Опернае выканальніцкае майстэрства: С.Данілюк, М.Гулегіна. Фальклорная тэма ў творчасці Р. Шырмы. Беларускі балет. Творчасць В. Елізар'ева. Тэндэнцыі развіцця сучаснай музычнай культуры: стылістычны плюралізм у сферы кампазітарскай творчасці, абнаўленне фактару этнічнай актуальнасці і інш. Вядучыя кампазітары рэспублікі: В.Кузняцоў, А.Мдзівані, Д.Смольскі, Г.Гарэлава, В.Капыцько і інш. Філармонія: рэпертуар, выканаўцы, канцэртная дзейнасць. Музычныя тэатры рэспублікі. Эстрадная музычная культура: выканаўцы, фестывалі, конкурсы. Рок-музыка («Крама», «Уліс»); фолк-рок («Песняры», «Троіца», «Палац»).

**38. Кіно Расіі (савецкі перыяд)**

Арганізацыйныя мерапрыемствы ў галіне кіно пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Маскоўскае асяроддзе кінарэжысёраў: Л.Куляшоў, С.Эйзенштэйн, У.Пудоўкін. Дзейнасць ФЭКСаў (Г.Козінцаў, Л.Траўберг, С.Юткевіч і інш.). Пераход ад нямога да гукавога кіно. Фільм братоў Васільевых «Чапаеў» (1934) як прыклад увасаблення тэмы грамадзянскай вайны. Магчымасць творчага ператварэння літаратурнай і тэатральнай класікі ў гукавым кіно. Пераадоленне канонаў бесканфліктна-параднага кінематографа на мяжы 1950–1960-х гг. З'яўленне новых і трансфармацыя старых тэм. Абнаўленне кінамовы. Два асноўныя кірункі жанрава-стылявых пошукаў кіно 1960-х гг.: «паэтыка-дакументальны» (Г.Данэлія, А.Іаселіяні, М.Хуцыеў) і «паэтыка-жывапісны» (С.Параджанаў, А.Таркоўскі). Творчыя знаходкі і пралікі. Цэнзурныя цяжкасці на шляху станаўлення таленавітых, арыгінальных задумак. Феномен «палічнага кіно». Нарастанне крызісных з'яў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў сферы культуры, літаратуры і мастацтваў. Супярэчлівасць развіцця кінамастацтва 1970–першай паловы 1980-х гг. Кінамастацтва 1985–1991 гг. Перамены творчага клімату ў кіно з пачатку перабудовы.

**39. Мастацтва эпохі постмадэрнізму. Агульная характарыстыка**

Тэндэнцыі ўзнікнення і развіцця постмадэрнісцкіх асаблівасцей. Філасофія постструктуралізму (Ж.Дзерыда, М.Фуко, Р.Барт, Ж.Бадрыяр, Ф.Джэймісан) – тэарэтычная аснова постмадэрнізму. Постмадэрнізм як светаадчуванне: «усё магчыма, але ўсё ўжо было» – свет страціў сваю значнасць з прычыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

агульнай дэвальвацыі каштоўнасцей. Постмадэрнізм як спосаб мыслення: «прынцып свабоднай гульні думкамі» (Ф.Ніцшэ) як сутнасць мастацкай творчасці ў сферы ідэй (эстэтычная пераапрацоўка інтэлігібельнага досведу). Постмадэрнізм як стыль. Постмадэрнізм як эпоха. Сусветнае распаўсюджванне тэлебачання ў канцы 1950-х гг. Крах мімесісу: замяшчэнне рэчаіснасці электроннымі вобразамі (сімулякрамі). Дэструкцыя персанажа як псіхалагічна і сацыяльна абумоўленага характару. Дэфакалізацыя героя і феномен інтэрперсанажа. «Смерць аўтара» і свабода інтэрпрэтацый. Адыход ад лінейнай апавядальнасці. Травесціраванне. Канцэпцыя інтэртэкстуальнасці (свет як тэкст, мастацкая культура як тэкст, чалавек як тэкст). Сімбіёз кітча і авангарда, духу і цялеснасці – аснова двухкодавай прыроды постмадэрнісцкага твора. Прынцып тыражнасці. Рэпрадуцыраванне як кансервацыя культурных каштоўнасцей. Серыйнасць як спосаб стварэння новых каштоўнасцей. Нейтралізацыя катэгорыі «часу» і мутацыя прасторы ў постмадэрнісцкую гіперпрастору. Рэчаіснасць візуальных міражоў. Мадэль свету, які распадаецца, у кінатворах рэжысёраў-постмадэрністаў.

**40. Беларускі тэатр на сучасным этапе**

Развіццё тэатральнага мастацтва Беларусі на мяжы XX–XXI стст. Пошук шляхоў абнаўлення тэатральнай мовы, выкарыстанне новых сродкаў сцэнічнай выразнасці. Вядучыя тэатры Рэспублікі Беларусь: Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Сучасны мастацкі тэатр, Беларускі рэспубліканскі тэатр юнага гледача і інш. Сучасныя беларускія рэжысёры: А.Ляляўскі, М.Пінігін, Б.Луцэнка, А.Гарцуеў, В.Баркоўскі, Р.Баравік, В.Анісенка, В.Еранькова, С.Кавальчык і інш. Сучасная беларуская драматургія: А.Дудараў, А.Дзялендзік, С.Кавалёў, А.Карэлін, А.Курэйчык і інш. Дасягненні сучаснага беларускага тэатра ў галіне драматургіі і падрыхтоўкі акцёраў. Міжнародныя тэатральныя фестывалі Беларусі: «Белая вежа», «Панарама», «ТЭАРТ», «Март-кантакт», «Тэатральны куфар» і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


1. *Агафонова, Н.А.* Компаративное искусствоведение: методологические стратегии и кинематографический ракурс / Н.А. Агафонова // Веснік БДУ культуры і мастацтваў. – 2007. – № 8. – С. 40–46.

2. *Аполлон.* Изобразительное и декоративное искусство. Архитектура : терминолог. слов. / под общ. ред. А.М. Кантора. – М. : Эллис Лак, 1997. – 736 с.

3. *Асеев, Б.Н.* Русский драматический театр от его истоков до конца XVIII века : учебник для театр. ин-тов / Б.Н. Асеев. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Искусство, 1987. – 576 с.

4. *Барышев, Г.И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г.И. Барышев. – Минск : Наука и техника, 1992. – 290 с.

5. *Грубер, Р.И.* Всеобщая история музыки : учеб. пособие / Р.И. Грубер. – 3-е изд. – М. : Музыка, 1965. – 484 с.

6. *Даркевич, В.П.* Народная культура Средневековья. Светская праздничная жизнь в искусстве IX–XVI вв. / В.П. Даркевич ; отв. ред. Г.К.Вагнер; АН СССР, Ин-т археологии. – М. : Наука, 1988. – 341 с.

7. *Дезез, Ж.* Кино : Кино 1 Образ-движение, Кино 2 Образ-время / [пер. с фр. Б. Скуратова], науч. ред. и вступ. ст. О. Аронсона. – М. : Ад Маргинем, 2004. – 622 с.

8. *Есин, А.Б.* Принципы и приемы анализа литературного произведения : учеб. пособие / А.Б. Есин. – 7-е изд., испр. – М. : Флинта, 2005. – 248 с.

9. *История* зарубежного театра : учебник для культ.-просвет. театр. учеб. заведений : в 3 т. / под общ. ред. Г.Н. Бояджиева. – М. : Просвещение, 1971–1977. – 3 т.

10. *Каган, М.* Морфология искусства / М. Каган. – Л. : Искусство, 1972. – 440 с.

11. *Культура* Древнего Рима: в 2 т. / редкол. : Ю.К. Колосовская [и др.]. – М. : Наука, 1985. – 2 т.

12. *Ливанова, Т.Н.* История западноевропейской музыки до 1789 года : в 2 т. / Т.Н. Ливанова. – М. : Музыка, 1982–1983. – 2 т.

13. *Ливанова, Т.Н.* Русская музыкальная культура XVIII века в ее связях с литературой, театром и бытом : в 2 т. / Т.Н. Ливанова. – М. : Музыка, 1952–1953. – 2 т.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. *Мдивани, Т.Г.* Западный рационализм в музыкальном мышлении XX века / Т.Г. Мдивани. – Минск : Беларус. навука, 2003. – 327 с.

15. *Менегетти, А.* Кино, театр, бессознательное / А. Менегетти. – М. : ННБФ «Онтопсихология», 2001. – Т. 1. – 384 с.

16. *Музыкальный* энциклопедический словарь / гл. ред. Г.В. Келдыш. – М. : Сов. энцикл., 1990. – 672 с.

17. *Назайкинский, Е.В.* Логика музыкальной композиции / Е.В. Назайкинский. – М. : Музыка, 1982. – 319 с.

18. *От эпохи* Возрождения к XX веку : сб. ст. / Акад. наук СССР. – М. : Изд-во АН СССР, 1963. – 272 с.

19. *Пави, П.* Словарь театра / П. Пави [пер. с фр.]. – М. : Прогресс, 1991. – 504 с.

20. *Петров, В.М.* Количественные методы в искусствознании / В.М. Петров. – Вып. 1: Пространство и время художественного мира. – М. : Смысл, 2000. – 204 с.

21. *Пракапцова, В.П.* Спасціжэнне майстэрства / В.П. Пракапцова. – Мінск : МФКД, 2006. – 206 с.

22. *Сапаров, М.А.* Об организации пространственно-временного континуума художественного произведения / М.А. Сапаров // Ритм, пространство и время в литературе и искусстве. – Л. : Наука, 1974. – С. 85–103.

23. *Современное* западное искусство. Идейные мотивы. Пути развития. Театр. Кино. Живопись. Музыка : сб. ст. / отв. ред. Г.А. Недошивин. – М. : Наука, 1971. – 360 с.

24. *Турчин, В.С.* Эпоха романтизма в России / В.С. Турчин. – М. : Искусство, 1981. – 550 с.

25. *Тэатральная* Беларусь : у 2 т. / пад рэд. А.В. Сабалеўскага. – Мінск : БелЭн, 2002–2003. – 2 т.

26. *Философия* эпохи постмодерна : сб. переводов и рефератов / сост., ред. А.Р. Усманова. – Минск : ИООО «Красико-принт», 1996. – 207 с.

27. *Хангельдиева, И.Г.* Музыка : театр, кино, телевидение / И.Г. Хангельдиева. – М. : Сов. композитор, 1991. – 156 с.

28. *Эйзенштейн, С.М.* Неравнодушная природа / С.М. Эйзенштейн // Избр. произвед. : в 6 т. – М. : Искусство, 1963–1971. – М. , 1964. – Т. 3. – С. 36–433.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВАЎ**

*Праграма ўступнага іспыту*
*па спецыяльнасці другой ступені вышэйшай адукацыі*
*1-21 80 14 Мастацтвазнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2013. Фармат 60х84 $^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,98. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
ЛИ № 02330/0003939 ад 19.05.2011.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ